Мы цалкам Твае, Марыя!

Аўтар: Кінга Красіцкая
14.08.2016 00:00



Урачыстасці ў гонар Маці Божай Кангрэгацкай прайшлі 4–5 жніўня ў катэдральным касцёле св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. Шматлікія вернікі цягам дваццаці чатырох гадзін няспынна чувалі перад цудатворным абразом, праслаўляючы веліч Найсвяцейшай Маці ды ўзносячы малітвы аб Яе заступніцтве і дапамозе. Згодна з традыцыяй урачыстасці ў гонар Маці Божай Кангрэгацкай папярэднічала малітоўнае чуванне, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх парафій горада. Кульмінацыйным момантам свята стала адпустовая св. Імша, якую цэлебраваў біскуп Віцебскі Алег Буткевіч.

Звяртаючыся да шматлікіх вернікаў, прысутных на набажэнстве, іерарх адзначыў выключную ролю Марыі ў жыцці кожнага чалавека. Біскуп падкрэсліў, што Маці Божая апекуецца намі, а мы павінны дбаць пра тое, каб вера, захаваная і перададзеная старэйшым пакаленнем, надалей фармавала жыццё грамадства. “Сённяшні свет патрабуе сведкаў Езуса Хрыста, якія б не навучаннем ці словам, а звычайным штодзённым жыццём сведчылі аб сваёй веры, аб Божым Валадарстве, брамы якога адкрыў для свету Езус. Няхай Божая Маці і Яе заступніцтва дапаможа нам трываць у еднасці з Хрыстом, і праз гэта – у радасці Яго Валадарства”, – сказаў іерарх. †

Мы цалкам Твае, Марыя!

Аўтар: Кінга Красіцкая
14.08.2016 00:00

